УДК 821.161.3-343.4

Навуч. Д.С. Жывушка
Навук. кір. Л.І. Неўгень, настаўнік беларускай мовы і літаратуры
(ДУА "Сярэдняя школа № 1 г. Скідзеля")

# ЖАНР ЛІТАРАТУРНАЙ КАЗКІ Ў ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ТВОРАЎ ГАННЫ СКАРЖЫНСКАЙ-САВІЦКАЙ І ГАЛІНЫ САМОЙЛА)

Казачны эпас – самы вялікі здабытак беларускай нацыянальнай культуры, і па сённяшні дзень захоўвае сваё эстэтычнае, пазнавальнае і выхаваўчае значэнне.

У сучаснай беларускай літаратуры жанр казкі развіваецца найбольш актыўна. Пісьменнікі звяртаюцца да традыцыйных фальклорных сюжэтаў ці рэалізуюць уласную арыгінальную аўтарскую задумку. У любым выпадку літаратурная казка адпавядае жанравым патрабаванням, што не адмяняе аўтарскага права на эксперымент і арыгінальнасць.

Казкі ўздзейнічаюць на дзяцей эстэтычна, даюць незабыўныя ўрокі маралі, вучаць сумленнасці, сціпласці, працавітасці, душэўнай чуласці і дабрыні. Актыўна ўплываюць на мову дзяцей, дапамагаюць адчуць прыгажосць роднага слова, мудрасць народа.

Таму ёсць неабходнасць акцэнтаваць важнасць мастацтва казкі для грамадства ў цэлым і асобе ў прыватнасці. Не абыходзяць гэты жанр і гродзенскія аўтары: Ганна Скаржынская-Савіцкая, Пётр Сямінскі, Галіна Самойла.

Актуальнасць тэмы даследавання абумоўлена пашырэннем жанру літаратурнай казкі ў цяперашні час; неабходнасцю аб'ктыўнага асэнсавання стану і перспектыў беларускіх разнавіднасцей гэтага жанру, іх ролі ў сучасным літаратурным працэсе.

Мэта даследавання – выяўленне асаблівасцей жанру ў творах Г. Скаржынскай-Савіцкай і Г. Самойла.

Для рэалізацыі дадзенай мэты вырашаюцца наступныя задачы:

- паказаць адметныя рысы жанру літаратурнай казкі, вызначыць яе стан у сучаснай беларускай літаратуры;
- даследаваць літаратурныя казкі са зборніка "Надзейка-чарадзейка" Г. Скаржынскай-Савіцкай як узор згаданага жанру;
- паказаць характэрныя адзнакі літаратурнай казкі ў творчасці Г. Самойла на прыкладзе казкі "Чароўны ліхтарык";
- вызначыць рысы падабенства і адрознення ў жанравай форме твораў абодвух аўтараў.

Аб’ект даследавання – творы, што належаць да жанру літаратурнай казкі ў Г. Самойла і Г. Скаржынскай-Савіцкай.

Прадмет даследавання – характэрныя адзнакі жанру літаратурнай казкі ў творах згаданых аўтараў.

Гіпотэза: жанр літаратурнай казкі мае запатрабаванасць у творчасці прадстаўнікоў сучаснага беларускага пісьменства, якія працягваюць традыцыі папярэднікаў і развіваюць гэты напрамак на далей.

Метадалагічнай базай для працы паслужылі даследаванні Кабашнікава К.П. “Сустрэчы з казкай”, Л. Алейнік “Жыццё – не казка. Але ў казцы – падказка…”, вучэбны дапаможнік Беларуская дзіцячая літаратура, пад рэдакцыяй М.Б. Яфімава, С. Шамякінай “Беларуская літаратурная казка”.

Метады даследавання: параўнальна-супастаўляльны, апісальны, культурна-гістарычны.

Практычная значнасць работы: даследаваны матэрыял выкарыстаны на ўроках беларускай літаратуры, гісторыі, пазакласнай дзейнасці, з паведамленнем па дадзенай рабоце выступілі на раённай і абласной навукова-практычных канферэнцыях, матэрыялы навуковай работы былі размешчаны на сайце Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Работа складаецца з уступу, трох раздзелаў, заключэння, спісу выкарыстаных крыніц, дадатку.

Праведзеныя назіранні за жанрам літаратурнай казкі дазволілі зрабіць наступныя вывады:

1. Азначэнні жанру – літаратурная, ці аўтарская, ці пісьменніцкая казка – указваюць на адну з яго галоўных асаблівасцей, па якой яго адрозніваюць ад казкі фальклорнай: наяўнасць аўтара-пісьменніка, прысутнасць у тэксце аўтарскага пачатку, індывідуальнага стылю пісьменніка-творцы. Беларуская літаратурная казка мае працяглую гісторыю развіцця і налічвае даволі шмат аўтараў, творы многіх з іх валодаюць вялікай мастацкай вартасцю. Мы вызначылі высокі ўзровень запатрабаванасці ў сучасных аўтараў і даследаванасці ў навукоўцаў К.П. Кабашнікава, С.Шамякінай, Л. Анікінай. Жанр пашыраны ў пісьменнікаў Г. Марчука, Р. Баравіковай, В. Гапеева, А. Федарэнкі, А. Бадака. Гродзенскія пісьменнікі Г. Скаржынская-Савіцкая, Г. Самойла працягваюць традыцыі казачнага пісьменства.

2. Казкі Г. Скаржынскай-Савіцкай, якія ўвайшлі ў зборнік “Надзейка-чарадзейка”, арыгінальныя і цікавыя, і прызначаны для

дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Ва ўсіх казках добрая канцоўка-вывад, звычайна гэта апошні абзац, ужываюцца словы з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі, адбываюцца чарадзействы, напрыклад, Надзейка-чарадзейка вылечыла хлопчыка. У казках Г.Скаржынскай-Савіцкай невялікая колькасць герояў, усе героі, сюжэты выдуманыя, фантазія аўтара. Яны невялікага аб’ёму, словы ўжываюцца адназначныя, зразумелыя малым чытачам, пачынаюцца казкі класічна: жыў, жыла, жылі-былі. Героямі твораў з’яўляюцца жывёлы, людзі, прадметы, маральныя якасці. У пісьменніцы няма апісанняў прыроды, як звычайна ў мастацкіх творах. Прырода служыць фонам, на якім адбываюцца дзеянні твора. Але ўсё ж пра навакольны свет падаецца дастаткова звестак (казка “Як Звончык шукаў утульную хатку”). Казкі будуць вельмі цікавымі дапытліваму чытачу, які яшчэ верыць у цуд і ўмее здзіўляцца, пашыраюць кругагляд дзяцей, насычаюць новымі ведамі і садзейнічаюць развіццю разумовых здольнасцей. Разам з гэтым, яны валодаюць вялікім выхаваўчым патэнцыялам. Казкі Г.Скаржынскай-Савіцкай шырока вядомыя не толькі на Гродзеншчыне, але і ў Беларусі, уключаны ў школьную праграму, адзначаны на дзяржаўным узроўні.

3. Казка “Чароўны ліхтарык” Г. Самойла – гэта псіхалагічна-філасофскае разважанне, героям даецца не толькі знешняя характарыстыка, але і ўнутраная, героі маюць сваіх прататыпаў, яны ўзятыя з жыцця. Твор прызначаны для дзяцей сярэдняга ўзросту, а таксама для дарослых, а яны ўжо добра ведаюць, што ўжыцці праўда, а што – не. У ім казачнае пераплятаецца з апавядальным. Шмат апісанняў прыроды складае істотнае адрозненне літаратурнай казкі ад народнай. Канцоўка твора заклікае да роздуму пра барацьбу дабра са злом. Хочацца, каб кожны, апынуўшыся ў пэўнай жыццёвай сітуацыі, узгадаў “Чароўны ліхтарык” і, па магчымасці, не дазваляў размнажацца жорсткасці, абыякавасці, нахабству, грубасці, бяздумнасці.

4. Казкі гэтых дзвюх пісьменніц чарадзейныя, нават па назве падобныя, шырока выкарыстоўваюцца словы з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі, героі казак аднолькавыя, гэта Шчырасць, Надзея (“Шчырасць і Зайздрасць” Г. Скаржынскай-Савіцкай), Залацінка і Сонечны зайчык. У казках прысутнічае захапляльны сюжэт, які заклікае задумацца аб каштоўнасцях сучаснага жыцця і ўзаемаадносінах паміж людзьмі.

Адрозніваюцца казкі сваім адметным мастацкім стылем, аўтарскім поглядам на жыццё, сваім аб’ёмам, рознай катэгорыяй

чытачоў, якім яны адрасаваны, канцоўкай (Поўная перамога дабра – Г. Скаржынская-Савіцкая, Жорсткасць застаецца жыць – Г. Самойла). У казцы “Чароўны ліхтарык” няма герояў жывёл.

Такім чынам, літаратурная казка адпавядае жанравым патрабаванням, што не адмяняе аўтарскага права на эксперымент і арыгінальнасць. У сучаснай літаратурнай казцы традыцыі і наватарства арганічна спалучаюцца. Жанравыя прыкметы зместу і формы казкі аўтарамі вытрымліваюцца. Пісьменнікі пашыраюць магчымасці традыцыйнага жанру: у адборы персанажаў, у адсутнасці яўна выражанага канфлікту дабра і зла, у лакалізацыі прасторы, у дамінаванні пазнавальнага аспекту зместа.

## ЛІТАРАТУРА


1. Беларуская дзіцячая літаратура: Вучэб. дапам. / А.М. Макарэвіч і інш.; Пад агульн. рэд. А.М. Макарэвіча, М.Б. Яфімавай. Мн: Вышэйшая школа, 2008. – 688 с.
2. Кабашнікаў К.П. Казкі //Беларуская вусна-паэтычная творчасць: Падруч. для студэнтаў філал. спец. ВНУ / К.П. Кабашнікаў, А.С.Ліс, А.С. Фядосік і інш. – Мн., 2000. – 313с.
3. Нікіфорская, А. Я – галінка/ А. Нікіфорская// Літаратура і мастацтва, № 19. – 2014. – 6с. [Электроны рэсурс]: рэжым доступу: http: // www.main.lim.by /wp-content/uploads / 2014/05/19-2014.pdf , дата 21.01.2019.
4. Самойла, Г. Чароўны ліхтарык. Казка:/Г. Самойла. – Гродна: ТАА “ЮрСаПрынт”, 2013. – 64с.
5. Скаржынская-Савіцкая, Г.І. Надзейка-чарадзейка: казкі: для дзяцей мал. шк. узросту/ Г.І. Скаржынская-Савіцкая; маст. Г.І. Скаржынская-Савіцкая. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2014. – 48 с.